Справаздача 2024

# ПАШЫРАЕМСЯ і РАСЦЕМ

*нягледзячы ні на што

# ЗМЕСТ


**1. Вітальнае слова** **03**
**Самае галоўнае — дзякуй!** 06
**2. Хто такія ІншыЯ** **07**
**3. Наша каманда** **10**
**4. «Іншыя» лічбы і факты** **16**
**5. Што мы робім** **20**
**Прасоўванне скразных каштоўнасцяў у грамадстве** **21**
Матэрыялы на сайце theothersby.org 22
Інфакампанія «Закаштуйся!» 23
Падкаст «ІншыЯ гісторыі» 24
Тыдзень нулявой дыскрымінацыі 25
Запуск TikTok 26
Міжнародныя даты 27
**Уключэнне скразных каштоўнасцяў у дзейнасць АГС і іншых стэйкхолдэраў** **29**
Даследаванне пра скразныя каштоўнасці 30
Кансультацыі па скразных каштоўнасцях 32
Дайджэст «Што новага?» 34
Курс «Рабі смела!» 35
Анлайн-курс «Курс на каштоўнасці» 37
Развіццё сувязяў паміж грамадскім сектарам і медыя 38
**Фармаванне і павелічэнне ўстойлівасці ўразлівых груп** **40**
**Арганізацыйнае развіццё** **42**
**6. Планы** **45**
**7. Як нас падтрымаць** **48**
**8. Кантакты** **51**

# ВІТАЛЬНАЕ СЛОВА

Хацелася б сказаць, што 2024 год быў лёгкім і прыемным для ўсіх нас, але, на жаль, гэта не было нашай рэчаіснасцю. У мінулым годзе шмат краін змянілі сваіх лідар_ак, у тым ліку і ЗША, што істотна паўплывала на міжнародныя адносіны. У свеце ўмацоўваліся такія трэнды, як папулізм і палярызацыя, шмат хто казаў пра «правы паварот» у Еўропе. У той жа час у Беларусі працягваліся затрыманні, людзей і арганізацыі прызнавалі «экстрэміст_камі» і «тэрарыст_камі», выносілі несправядлівыя прысуды.

Аднак мы не спыняліся і штодня працягвалі сваю працу на карысць роўнасці і інклюзіі. Мы пашыраліся і раслі, якімі б ні былі навіны. Так, напрыклад, у кастрычніку 2024 году наш сайт заблакавалі на тэрыторыі Беларусі. Унутры краіны нас стала магчыма чытаць толькі з VPN. Аднак мы зрабілі *«люстэрка»*, напісалі пасты-тлумачэнні і працягнулі працу.



У мінулым годзе было (задужа) шмат працы. Гэта прывяло нас не толькі да крутых дасягненняў і высокай ацэнкі нашай дзейнасці з боку каля_жанак, але і да (за)вялікай нагрузкі, якая ўпэўнена вяла нашую каманду да выгарання. Урэшце мы перажылі гэты напружаны і вельмі актыўны год, не згубілі сябе і нават умацавалі нашу каманду. Але вельмі хочам, каб 2025 год усё ж быў больш літасцівы да нас, да вас і да свету агулам.

## А цяпер мы радыя падзяліцца з вамі вынікамі нашай дзейнасці ў 2024 годзе!

# САМАЕ ГАЛОЎНАЕ — ДЗЯКУЙ!

У 2024 годзе шмат важных рэчаў мы зрабілі ў партнёрстве з крутымі арганізацыямі, ініцыятывамі, актывіст_камі, журналіст_камі і эксперт_камі: пасты, артыкулы, падкаст, мерапрыемствы і нават цэлыя праекты! Азіраючыся на вынікі сумеснай працы, мы хочам яшчэ раз сказаць **вялікі дзякуй усім нашым партнёр_кам!** Мы радыя нашай сумеснай працы і чакаем яе працяг. Шкада, што з розных прычынаў мы не можам згадаць усіх вас у гэтай справаздачы.

Асобны дзякуй нашым чытач_кам, падпісчы_цам і ўдзельні_цам мерапрыемстваў! Вашая падтрымка і актыўнасць — тое, што натхняе нас рухацца далей і ствараць новыя праекты.

# ХТО ТАКІЯ ІНШЫЯ

**ІншыЯ — беларуская моладзевая арганізацыя, заснаваная 4 сакавіка 2022 году, якая працуе для Беларусі і моладзі Беларусі, і складаецца з маладых беларус_ак, якія вымушана жывуць у розных краінах**

# МІСІЯ

**Развіццё інклюзіўнага і талерантнага грамадства, у якім усе пачуваюцца сабою і не падвяргаюцца дыскрымінацыі**

## КАШТОЎНАСЦІ

- Правы чалавека, у тым ліку ўзаемапавага, роўнасць, недыскрымінацыя
- Інклюзія
- Гендарная роўнасць
- Экапрыязнасць

## КІРУНКІ ДЗЕЙНАСЦІ

- Прасоўванне скразных каштоўнасцяў у грамадстве
- Уключэнне скразных каштоўнасцяў у дзейнасць АГС і іншых стэйкхолдэраў
- Фармаванне і павелічэнне ўстойлівасці ўразлівых груп
- Арганізацыйнае развіццё

# НАША КАМАНДА

Усё тое, чаго мы дасягнулі ў 2024 годзе, было зроблена дзякуючы нашай крутой камандзе! Мы ўсе розныя, жывем у розных гарадах і краінах, робім розныя задачы, любім займацца зусім рознымі рэчамі і вельмі па-рознаму адпачываем. Але мы цэнім і клапоцімся адно пра аднаго, і вельмі радуемся, калі маем магчымасць пабачыцца афлайн. А яшчэ, нягледзячы на нашую адрознасць і на, здавалася б, вельмі ўтапічную мару змяніць свет да лепшага, мы разумеем, што нават невялікія дзеянні здольныя зрабіць жыццё кожнага канкрэтнага чалавека і не-чалавека крыху лепшым. А гэта ўжо вельмі шмат і вартае таго, каб гэта рабіць.

У 2024 годзе нашая каманда *атрымала* **прэмію J4T AWARDS 2024**. Ініцыятыва «Журналісты за талерантнасць» узнагародзіла ІншыЯ ў намінацыі **«Каманда года»** за «актыўную працу па наладжванні сувязяў паміж НДА і медыя, а таксама медыя-працу як платформы для аўтар_ак, якія пішуць пра ўразлівыя групы».



**Дзякуй за высокую ацэнку нашай працы!**
Мы гэта цэнім і гэта моцна матывуе нас не спыняцца!

# ЦЯПЕР НАС 13 ЧАЛАВЕК:



## 4 ПАРТНЁР_КІ

ядро каманды, якое адказвае за пастаноўку і дасягненне мэтаў і задач



## 9 ПРЫХІЛЬ_НІЦ

людзі, якія дапамагаюць арганізацыі дасягаць пастаўленых мэтаў і задач



## ТЫ ТАКСАМА МОЖАШ СТАЦЬ ЧАСТКАЙ ІНШЫЯ!

У 2024 годзе мы адкрылі *набор у нашую валанцёрскую каманду*.

Цяпер усе ахвотныя могуць падаць заяўку і далучыцца да нашай каманды, каб разам з намі рабіць гэты свет больш інклюзіўным!

# СУЗАСНАВАЛЬ_НІЦЫ І ПАРТНЁР_КІ

Гатую прысмакі,
вяжу топы, гляджу
дэтэктыўныя серыялы



## ДАША

каардынатарка ZDW

## ДЗІМА

мэнаджар праектаў,
дырэктар



Гуляю ў настолкі
і маніякальна
паглынаю серыялы
на Netflix

Вырошчваю раслінкі
і збіраю калекцыю
кніг Тэры Пратчэта



## МАРЫНА

мэнаджарка праектаў

## САША

дызайнерка,
псіхалагіня



Люблю BTS,
чытаю фанфікі

# ПРЫХІЛЬНІ_ЦЫ

Люблю ёгу і ўсе, што з ёй звязана, а таксама падарожнічаць



## АРЫША

PR і арганізацыя мерапрыемстваў

Люблю мастацкую літаратуру, выпякаць усялякія штукі і захапляюся культурна-гістарычнай спадчынай



## ВОЛЯ

перакладчыца

Танчу VOGUE, калекцыяную і вельмі люблю слухаць вінiл, капаюся ў сваім мозгу



## ДЗІМА

фінансавы мэнаджар

Люблю мастацтва, фатаграфіі, коміксы, вёскі



## ЖЭНЯ

рэдактарка сайта

Вяду (нікому непатрэбны) філасофскі гуртoк



## ЗМІЦЕР

SMM-спецыяліст

# ПРЫХІЛЬНІ_ЦЫ

Люблю дызайн,
пісаць тэксты і людзей.
Сумяшчаю гэта ўсё ў SMM



## КАЦЯ

SMM-спецыялістка

Люблю футбол
і піць каву ў адзіноце



## ЛЁША

спецыяліст
па рэкламе

Люблю тэхніку,
экалогію
і ўвесь гэты свет.
Самаабвешчаны
кароль пацукоў



## СЯРГЕЙ

кантэнт-мэйкер

Займаюся на пілоне,
вывучаю жэставую мову,
арганізоўваю прастору



## ЮЮ

перакладчыца,
рэдактарка

*Мы хочам заставацца бачнымі нават у гэтыя няпростыя часы. Але, на жаль, не для ўсіх людзей з нашай каманды гэта бяспечна. Каб захаваць прыватнасць некаторых з нас і ў той жа час прадставіць усіх на роўных умовах, мы папрасілі нейрасетку Midjourney стварыць нашыя партрэты-вобраз.*

# «ІНШЫЯ» ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

# ШТО БЫЛО З МЕРАПРЫЕМСТВАМІ

**62** мерапрыемствы
* на 25 больш, чым у 2023

**670+** удзель_ніц
+ 200 да 2023 году

**25** партнёр_ак у межах ZDW 2024
* на 5 больш, чым у 2023

**0** публічных фотаздымкаў з мерапрыемстваў

**ІншыЯ**

**27** мерапрыемстваў

**270+** удзель_ніц

**Партнёрскія**

**35** мерапрыемстваў
* на 19 больш, чым у 2023

**400+** удзель_ніц

**54** афлайн
* у 2 разы больш, чым у 2023

**4** краіны

**12** гарадоў

**8** анлайн

**48** за мяжой
* у 2,5 разы больш, чым у 2023

**14** у Беларусі

# А ВОСЬ ШТО З КАНТЭНТАМ

**54**
новыя артыкулы на сайце

**19**
выпускаў рассылкі «Што новага?»

**423**
хвіліны падкаста «Іншыя гісторыі»

**1**
новы канал у TikTok

**46 000+** * *у 3,5 разы больш, чым у 2023*
чалавек наведалі сайт

**4700+** * *у 1,3 разы больш, чым у 2023*
падпісант_ак у сацсетках

**736 600+** * *у 4 разы больш, чым у 2023*
ахопы матэрыялаў у сацсетках

**33 000**
узаемадзеянняў у сацсетках

# І ЯШЧЭ ТРОШКІ ЛІЧБАЎ, ЯКІЯ АДЛЮСТРОЎВАЮЦЬ, ЯК ГЭТА ЎСЁ РАБІЛАСЯ

**17 493**
паведамленні ў Slack

**4**
краіны, у якіх жыве каманда

**∞**
клопату пра каманду

**240**
еўра данатаў

**11**
рэалізаваных праектаў

**1**
новы вельмі жыццёвы *стыкерпак у Тэлеграме*

**1**
новая кава-машына

**4**
чалавекі спатрэбілася, каб адкрыць пачак манга на кава-паўзу

# ШТО МЫ РОБІМ

# ПРАСОЎВАННЕ СКРАЗНЫХ КАШТОЎНАСЦЯЎ У ГРАМАДСТВЕ

# МАТЭРЫЯЛЫ НА САЙЦЕ THEOTHERSBY.ORG

У 2024 годзе мы выпусцілі **54 новыя матэрыялы** (на адзін больш, чым у мінулым годзе), якія прачыталі больш за 14 000 чалавек. Артыкулы раскрываюць розныя аспекты скразных каштоўнасцяў і расказваюць пра вопыт уразлівых груп.

Тэкст нашага журналіста Аляксея Гуліцкага *«Пра нас шмат выдумляюць і пляткараць, але ніхто не жадае з намі пазнаёміцца»*. *Гісторыя рама-актывісткі Расмы* заняў **1-е месца** ў намінацыі «Матэрыял пра роўнасць і недыскрымінацыю ўразлівых груп» прэміі **«J4T AWARDS»** ад ініцыятывы *«Журналісты за талерантнасць»*.

## САМЫЯ ПАПУЛЯРНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ ЗА 2024 ГОД

- *Што такое слюр, і як мы яго выкарыстоўваем, самі таго не ведаючы*
- *Чэк-ліст: як спраўляцца са стрэсам і выгараннем*
- *Гісторыя Аксаны, якая з 15 год сама выхоўвае дачку і не здаецца*
- *Гісторыя Любы, якая мела досвед спажывання псіхаактыўных рэчаваў у Беларусі, а ў эміграцыі запусціла наркафем ініцыятыву*
- *«Прыродзе ўсё роўна, што напісана ў пашпарце». Гісторыя інтэрсэкс-дзяўчыны Вікторыі*

# ІНФАКАМПАНІЯ «ЗАКАШТУЙСЯ!»

Каб прыцягнуць увагу падпісчы_ц да тэмы скразных каштоўнасцяў і даць інструменты для іх укаранення ў паўсядзённае жыццё, восенню 2024 года мы правялі інфакампанію ў Instagram, TikTok і Telegram — ***#закаштуйся***.

Галоўная ідэя кампаніі *«Закаштуйся!»* палягала ў тым, што скразныя каштоўнасці — гэта не проста тэарэтычныя прынцыпы, а разнастайныя практыкі, якія можна лёгка ўключыць у штодзённае жыццё.

**3**
партнёрскія матэрыялы

**30**
публікацый у нашых сацсетках

**38 400+**
ахоп кампаніі

**1500+**
узаемадзеянняў з матэрыяламі







#ЗАКАШТУЙСЯ

# ПАДКАСТ «ІНШЫЯ ГІСТОРЫІ»

У 2024 годзе выйшаў першы сезон падкасту «Іншыя гісторыі». У ім можна паслухаць гісторыі беларус_ак у эміграцыі з няпростым жыццёвым досведам. За год было выпушчана **8 эпізодаў**.

Сярод герaіняў — жанчына, якая паўнавартасна жыве са станоўчым ВІЧ-статусам; дзяўчына з досведам нарказалежнасці і бяздомнасці; 72-гадовая жанчына, якая стала блогеркай і пачала новае жыццё ў эміграцыі.

Падкаст дае магчымасць атрымаць адказы на пытанні, якія сорамна было б задаць, заўважыць стэрэатыпы і па-новаму паглядзець на іншых — тых, хто здаваўся незразумелым або далёкім. А ў нейкіх гісторыях, можа, і наадварот — пазнаць сябе.




**СЛУХАЙЦЕ ПАДКАСТ НА ЛЮБОЙ ЗРУЧНАЙ ДЛЯ ВАС ПЛАТФОРМЕ!**

# ТЫДЗЕНЬ НУЛЯВОЙ ДЫСКРЫМІНАЦЫІ

СТАРОНКА ТЫДНЯ НА САЙЦЕ

**1-10 сакавіка 2024 года** нашая арганізацыя правяла маштабную кампанію ў межах Міжнароднага дня нулявой дыскрымінацыі **(Zero Discrimination Day)** — штогадовай ініцыятывы Арганізацыі Аб’яднаных Нацый, якая заклікае да роўнасці ўсіх людзей перад законам і на практыцы.

Пачынаючы з 2020 года мы аб’ядноўваем вакол гэтага дня — а пасля і тыдня — розныя арганізацыі і ініцыятывы з мэтай гучна заявіць пра недапушчальнасць дыскрымінацыі.

У 2024 годзе мы засяродзіліся на тым, як па-рознаму можа праяўляцца дыскрымінацыя і якімі спосабамі з ёй змагацца. Разам з партнёр_камі мы правялі **22 мерапрыемствы**, 19 з якіх прайшлі афлайн у Беларусі, Літве, Польшчы і Грузіі. Мерапрыемствы наведала **больш за 240 неабыякавых людзей!**

Сярод мерапрыемстваў былі гульнятэкі з нашай настольнай гульнёй «Веру-НеВеру», трэнінгі, варкшопы, прагляды спектакляў і кіно з абмеркаваннямі, квіз, інтэрактыўныя і сацыяльныя гульні, форум-тэатр, лекцыі і дыскусіі, маляванне на шоперах, вебінары і Жывая бібліятэка!

**90%**
удзельні_ц задумаліся пра сваё стаўленне да ўразлівых груп

**90%**
удзельні_ц даведаліся новае па тэме роўнасці і недыскрымінацыі

**690K+**
ахопы матэрыялаў і пастоў з хэштэгамі

# ЗАПУСК TIKTOK

У сакавіку 2024 мы *запусцілі* TikTok, асноўная мэта якога — простымі словамі расказваць пра сур'ёзныя рэчы: гендарную роўнасць і экалогію, каханне і дыскрымінацыю, правы чалавека і павагу да разнастайнасці. Наш TikTok — не проста блогерскі праект, а **месца, дзе кожн_ая зможа знайсці нешта блізкае для сябе**, атрымаць падтрымку і ўвагу. За 2024 год у нас атрымалася стварыць утульную, бяспечную і інклюзіўную суполку для **1000+ падпісант_ак**.

Пад канец года мы пачалі перакладаць трэнды на беларускую мову і зрабілі 31 відэа на нашыя «гукі». *Самае паспяховае* — набрала больш за 20 000 праглядаў!

**261 000+**
праглядаў відэа

**3 000+**
каментароў

**29 000+**
падабаек

**811**
рэпостаў

**Вось так нас віншавалі з Днём народзінаў нашага TikTok**



# МІЖНАРОДНЫЯ ДАТЫ

Адным са сталых кірункаў нашай працы з'яўляецца асвятленне міжнародных датаў, звязаных з правамі чалавека і становішчам розных уразлівых груп. Міжнародныя даты — **дадатковая нагода**, каб зрабіць групу больш бачнай і звярнуць увагу на складанасці, з якімі яна сутыкаецца.

У 2024 годзе мы правялі **14 мерапрыемстваў**, прымеркаваных да розных дат, у Беларусі, Літве, Польшчы і анлайн, якія наведалі **больш за 160 чалавек**.

## СЯРОД ДЗЁН, ЯКІЯ МЫ АСВЯТЛЯЛІ, БЫЛІ:

- Міжнародны дзень бачнасці трансгендарных людзей
- Сусветны дзень распаўсюджвання інфармацыі пра праблемы аўтызму
- Міжнародны дзень супраць гамафобіі, біфобіі і трансфобіі
- Сусветны дзень кантрацэпцыі
- Міжнародны дзень культурнай разнастайнасці
- Міжнародны дзень бежан_цаў



# МІЖНАРОДНЫЯ ДАТЫ

Многія мерапрыемствы мы праводзілі супольна з іншымі арганізацыямі і ініцыятывамі. Сярод фарматаў мерапрыемстваў былі кінапрагляды, арт-майстэрні, калажныя майстэрні, лекцыі, квізы, прамыя эфіры, нэтворкінгі і іншыя.

**Акрамя гэтага мы развівалі нашую супольнасць у Вільнюсе:**
стварылі асобны
***Тэлеграм-канал «Іншы Вільнюс»***,
дзе публікуем анонсы нашых лакальных падзей.

**Далучайцеся!**







# УКЛЮЧЭННЕ СКРАЗНЫХ КАШТОЎНАСЦЯЎ У ДЗЕЙНАСЦЬ АГС І ІНШЫХ СТЭЙКХОЛДЭРАЎ

# ДАСЛЕДАВАННЕ ПРА СКРАЗНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ

Увесну 2024 году з дапамогай сацыёлага Філіпа Біканава мы правялі глыбінныя інтэрв'ю з прадстаўні_цамі 20 беларускіх грамадскіх арганізацый розных кірункаў працы. Нашай мэтай было высветліць, якім чынам яны ўкараняюць у сваю дзейнасць такія скразныя каштоўнасці, як **інклюзіўнасць, гендарная роўнасць і экапрыязнасць**, і ці важна гэта для іх увогуле.



Дзякуючы даследаванню мы даведаліся, як прадстаўні_цы арганізацый разумеюць скразныя каштоўнасці, якія практыкі выкарыстоўваюць у штодзённай працы, з якімі праблемамі сутыкаюцца і якія патрэбы ёсць у гэтай сферы.

ТЭКСТ ДАСЛЕДАВАННЯ НА САЙЦЕ

# ДАСЛЕДАВАННЕ ПРА СКРАЗНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ

Згодна з вынікамі даследавання мы распрацавалі *рэкамендацыі*, якія падсвятляюць тонкія месцы ў тэме скразных каштоўнасцяў і могуць служыць своеасаблівым компасам для паўсядзённых дзеянняў. Рэкамендацыі прызначаны для арганізацый, чыя дзейнасць наўпрост скіраваная на паляпшэнне сітуацыі са скразнымі каштоўнасцямі ў беларускім грамадскім сектары.

Адказ на пытанне з інтэрв'ю «Што вас матывуе прымяняць розныя каштоўнасці на практыцы?»:

*«Для мяне гэта проста як база. Базавая рэч, якую ты робіш толькі таму, што гэта тое, як гэта робіцца ў цывілізаваным грамадстве […], гэта проста культурна ўкаранілася ў нас у арганізацыі, што мы робім гэтыя рэчы і думаем пра гэта ўвесь час»*

# КАНСУЛЬТАЦЫІ ПА СКРАЗНЫХ КАШТОЎНАСЦЯХ

Каб дапамагчы арганізацыям лягчэй укараняць скразныя каштоўнасці ў працу, паводле вынікаў згаданага вышэй *даследавання* мы адкрылі магчымасць атрымаць бясплатныя экспертныя кансультацыі. У 2024 годзе мы апрацавалі **27 запытаў на кансультацыі**, з якіх 24 запыты атрымалі ад нас падтрымку.

## Як адбываюцца кансультацыі?

Спачатку мы робім кароткі сазвон, каб удакладніць запыт. Пасля гэтага прапаноўваем магчымыя варыянты рашэння. Найчасцей гэта ўступная ацэнка (апытанне каманды), аналіз вынікаў апытання, супольнае абмеркаванне вынікаў, адукацыйнае мерапрыемства для каманды па найбольш актуальнай тэме. Калі арганізацыя адразу мае дакладны запыт, то мы праводзім кароткую кансультацыю: разбіраем запыт і шукаем шляхі для яго вырашэння.

**145**
чалавек былі ахопленыя падчас кансультацый

**80%**
апытаных змаглі з нашай дапамогай змяніць ці палепшыць сваю дзейнасць

на **9,3*** *з 10 балаў*
ацанілі нашую падтрымку ў межах кансультацый

на **4,8*** *з 5 балаў*
ацанілі дастасоўнасць і актуальнасць рэкамендацый

**100%**
апытаных гатовыя рэкамендаваць нашыя кансультацыі

# КАНСУЛЬТАЦЫІ ПА СКРАЗНЫХ КАШТОЎНАСЦЯХ

***Парады Іншых — рэалістычныя і іх можна лёгка інтэграваць у працу. Таксама мне спадабаўся сапраўды індывідуалізаваны падыход — перад кансультацыямі і падчас іх сапраўды былі прыкладзеныя намаганні, каб зразумець, што нам сапраўды патрэбна, цікава ды актуальна***

***Наша сустрэча паўплывала на разуменне камандай агульных каштоўнасцей. У штодзённай дзейнасці мы вяртаемся да гэтых пытанняў і ацэньваем сваю дзейнасць праз неабходны "фокус". Скразныя каштоўнасці цяпер ужываюцца больш асэнсавана***

***Форма запыту кансультацый*** усё яшчэ адкрыта. Запаўняйце, каб даведацца, як укараніць скразныя каштоўнасці ў вашыя працэсы і распрацаваць канкрэтныя рашэнні, якія можна адразу прымяніць у вашай дзейнасці.

**Умовы правядзення кансультацый у 2025 годзе абмяркоўваюцца асобна адносна кожнага запыта*

# ДАЙДЖЭСТ «ШТО НОВАГА?»

У гэтым дайджэсце мы **штомесяц асвятляем важныя навіны** ў галіне правоў чалавека, інклюзіі, гендарнай роўнасці і экапрыязнасці, дзелімся класнымі анонсамі і магчымасцямі, расказваем пра новыя ініцыятывы і праекты.

Мінулыя выпускі дайджэсту можна *чытаць на нашым сайце* і ў сацсетках. Але калі вы хочаце атрымліваць яго як мага хутчэй, то *аформіце бясплатную падпіску* — і дайджэст будзе прыходзіць на вашую пошту на пачатку кожнага месяца.

**300 чалавек ужо атрымліваюць наш дайджэст!**

АФОРМІЦЬ ПАДПІСКУ

ЧЫТАЦЬ УСЕ ДАЙДЖЭСТЫ ЗА 2024



# КУРС «РАБІ СМЕЛА!»

Гэта базавы адукацыйны курс па арганізацыі мерапрыемстваў для тых, хто марыць зладзіць сваё першае мерапрыемства, але не ведае з чаго пачаць. На практычным курсе мы падзяліліся з **15 удзельні_цамі** сваімі «рэцэптамі» паспяховых мерапрыемстваў, якія могуць мяняць свет да лепшага і ўлічваюць скразныя каштоўнасці.

Курс складаўся з двух частак:

1. **Афлайн-інтэнсіў** з 1 па 6 ліпеня ў Вільнюсе (Літва). Мы вывучалі тэорыю і разам практыкаваліся ў планаванні мерапрыемстваў. Па выніках інтэнсіву ўсе ўдзельні_цы падрыхтавалі планы мерапрыемстваў.
2. **Самастойная практыка** цягам жніўня-лістападу для 8 удзельні_ц, чые планы мерапрыемстваў былі абраныя для нашай падтрымкі ў рэалізацыі.

**10**
эксперт_ак задзейнічана ў правядзенні курса

**83%**
удзельні_ц падвысілі свае веды па выніках курса

**100%**
удзельні_ц уключылі скразныя каштоўнасці ў сваю працу

**8**
удзельні_ц рэалізавалі свае мерапрыемствы

**94**
чалавекі прынялі ўдзел у мерапрыемствах удзельні_ц

**9,4*** *з 10 балаў*
верагоднасць таго, што ўдзельні_цы рэкамендуюць наш курс іншым арагнізатар_кам мерапремстваў

# КУРС «РАБІ СМЕЛА!»

## Водгукі пра курс

*«Курс “Рабі смела!” стаў для мяне знаёмствам з праектным планаваннем і з тым, як у свае праекты ўводзіць скразныя каштоўнасці. Курс быў цалкам накіраваны на тое, каб усе ўдзельні_цы атрымалі для сябе карысную інфармацыю і новы досвед (нават тыя, хто ўжо даўно гэтым займаецца), а пачаткоўцы, такія як я, атрымалі досыць ведаў для таго, каб не баяцца і пачаць ужо рабіць смела!»*

*«Гэты курс дазволіў нашай камандзе стварыць цудоўную прэзентацыю праекта, пачуць зваротную сувязь, пабачыць праект вачыма іншых людзей. Таксама мы навучыліся пітчыць праект — гэта было вельмі карысна. Скразныя каштоўнасці — асобны кірунак. Мы знайшлі ў сваім праекце і тыя каштоўнасці, якія былі не відавочныя. Гэты курс будзе карысны як для пачаткоўцаў, якія толькі-толькі ствараюць свой праект (ці маюць толькі ідэю), так і для тых, хто ўжо пачалі сваю дзейнасць»*

*«Гэта грунтоўны курс, які ставіць яго выпускнікоў на некалькі ступеняў вышэй у прафесійным узроўні. Праграма падабраная пад запыт сённяшняга культурнага сектара. Каманда арганізатар_ак сапраўды прыкладае максімум намаганняў, каб усе ўдзельні_цы ўзбагацілі веды і пачувалі сябе ў бяспецы і камфорце»*

# АНЛАЙН-КУРС «КУРС НА КАШТОЎНАСЦІ»

1 снежня на нашай *адукацыйнай платформе* з'явіўся новы **анлайн-курс для самастойнага навучання**. Ён дае **базавыя тэарэтычныя веды** пра скразныя каштоўнасці (правы чалавека, інклюзію, гендарную роўнасць і экапрыязнасць) і дэманструе прыклады практык па ўключэнні каштоўнасцяў у дзейнасць арганізацый і ініцыятыў.

Курс даступны для ўсіх ахвотных, яго можна праходзіць у зручным тэмпе, а па завяршэнні атрымаць сертыфікат. За снежань на курс зарэгістраваліся **15 чалавек**, з якіх 4 цалкам прайшлі курс і атрымалі сертыфікаты.

У падтрымку курса сумесна з запрошанымі эксперт_камі мы правялі **серыю з трох анлайн-заняткаў** «Скразныя каштоўнасці ў дзейнасці некамерцыйных арганізацый».

**28**
чалавек наведалі заняткі

**75%**
адзначылі іх высокую карысць

**83%**
плануюць выкарыстоўваць атрыманыя веды на практыцы

А для таго, каб веды пра скразныя каштоўнасці былі даступныя больш шырокаму колу актывіст_ак, па выніках анлайн-заняткаў эксперт_кі падрыхтавалі тэматычныя артыкулы:

- *Што такое гендарная палітыка і навошта яна грамадскай арганізацыі*
- *Гендарны аўдыт для НДА: навошта праводзіць і з чаго пачаць*
- *Правы чалавека як каштоўнасць і мэта. Падыход, заснаваны на правах чалавека, у дзейнасці арганізацый грамадзянскай супольнасці*

# РАЗВІЦЦЁ СУВЯЗЯЎ ПАМІЖ ГРАМАДСКІМ СЕКТАРАМ І МЕДЫЯ

У мінулым годзе мы пачалі рэалізацыю новага праекта **«Together for Values — JA»** сумесна з *Razam e.V.* і *«Журналісты за талерантнасць»*.

## Што мы робім у межах праекта?

- Аднаўляем разбураныя сувязі паміж грамадскім сектарам і медыя
- Павышаем прысутнасць важных тэмаў і ўразлівых груп у медыя
- Падтрымліваем плюралізм і інклюзію ў рэдакцыях
- Павялічваем бачнасць працы НДА

## Што было зроблена ў 2024 годзе?

- Два нэтворкінгі паміж НДА і медыя
- Варкшоп для журналіст_ак «Інклюзіўная журналістыка: Як пісаць пра ўразлівыя групы так, каб нікому не нашкодзіць»
- Трэнінг і ментарства для НДА па распрацоўцы камунікацыйных стратэгій
- Серыя вебінараў «Як працаваць ва ўмовах экстрэмізму»

**116**
чалавек прынялі ўдзел у мерапрыемствах праекта

**100%**
удзельні_ц адукацыйных фарматаў плануюць выкарыстоўваць атрыманыя веды на практыцы

**83%**
удзельні_ц нэтворкінгаў плануюць супрацоўніцтва з новымі кантактамі

**5**
арганізацый атрымалі кансультацыі і склалі планы паляпшэння публічнай камунікацыі

# РАЗВІЦЦЁ СУВЯЗЯЎ ПАМІЖ ГРАМАДСКІМ СЕКТАРАМ І МЕДЫЯ

## Водгукі пра адукацыйныя мерапрыемствы

**Алеся, 39 гадоў, удзельніца варкшопу для журналіст_ак:**

*«Я лічу, што гэты воркшоп карысны не толькі для журналіст_ак, але і для ўсіх людзей. Але асабліва для тых, хто піша і кажа пра іншых людзей, вяшчаючы на шырокую аўдыторыю. Самае карыснае — гэта не тэорыя, а рэальныя сустрэчы з прадстаўні_цамі ўразлівых групаў»*

**Воля, праваабаронца, удзельніца трэнінгу для НДА:**

*«Я не мела да гэтага досведу працы з камунікацыйнай стратэгіяй. Для маладой ініцыятывы гэта супер магчымасць ацаніць і сябе, і сваю дзейнасць і пачаць больш эфектыўна і якасна працаваць з аўдыторыяй, даносіць да яе важныя сэнсы, заахвочваць да важных зменаў»*

# ФАРМАВАННЕ
# І ПАВЕЛІЧЭННЕ
# ЎСТОЙЛІВАСЦІ
# ЎРАЗЛІВЫХ ГРУП

Для нашай арганізацыі гэта важны кірунак працы, бо ён скіраваны на тое, каб дапамагаць уразлівым групам узмацняць свае здольнасці і даваць рады тым знешнім фактарам, якія замінаюць іх развіццю. На жаль, у 2024 годзе ў нас так і не атрымалася знайсці сродкі на рэалізацыю хаця б часткі планаў у гэтым кірунку.

Аднак, усё ж на пачатку 2024 году мы выпусцілі ***артыкул «Як спраўляцца са стрэсам і выгараннем»***, які заняў другое месца па колькасці чытанняў на сайце. У дадатак да артыкулу мы зрабілі адпаведны ***чэк-ліст***, які дапамагае не толькі зразумець, як вы цяпер пачуваецеся, але і прапануе канкрэтныя практыкі для паляпшэння стану. Чэк-ліст спампавалі з сайта **амаль 150 разоў!**

Такі попыт проста на матэрыялы пра выгаранне ў дадатак да нашай працы ў 2023 годзе ў гэтым кірунку толькі пацвярджае **важнасць і неабходнасць дзейнічаць**. Спадзяёмся, што ў 2025 годзе мы знойдзем неабходныя сродкі на рэалізацыю нашых планаў!

# АРГАНІЗАЦЫЙНАЕ РАЗВІЦЦЁ

Развіццё і ўмацаванне патэнцыялу арганізацыі часта з'яўляецца тым кірункам працы, на які камандзе не хапае часу і высілкаў. Аднак мы для сябе вырашылі, што без вылучэння рэсурсаў на гэта, мы проста не зможам якасна аказваць паслугі нашым мэтавым групам. Таму ў 2024 годзе значную частку нашага працоўнага часу мы прысвяцілі развіццю нашай каманды і паляпшэнню розных арганізацыйных працэсаў.

## Што мы паспелі зрабіць за год?

- Двойчы **сустрэцца афлайн (амаль) усёй камандай**. Першы раз мы сустрэліся для карэктавання стратэгіі і ўдакладнення тактычнага плану. А другі раз прысвяцілі працы з псіхалагіняй, каб больш увагі надаць стану людзей у камандзе і працэсам, якія на гэта ўплываюць.
- Правялі **экааўдыт**, каб даведацца, што шмат чаго мы ўжо робім сапраўды экапрыязна і з клопатам пра навакольле. Але знайшлі і кропкі для росту!
- Распрацавалі ***інклюзіўную палітыку***, каб стварыць у арганізацыі максімальна спрыяльнае і камфортнае асяроддзе для ўсіх людзей.

## Што мы паспелі зрабіць за год?

- Падрыхтавалі ***палітыку прыватнасці***, бо клапоцімся пра персанальныя дадзеныя нашых карысталь_ніц і не хочам, каб яны трапілі не ў тыя рукі.
- Апублікавалі ***правілы выкарыстання кантэнта*** для нашага сайта і сацсетак, бо нарэшце асэнсавалі сябе як нішавае медыя. А якое ж медыя можа жыць без правіл карыстання яго кантэнтам?
- Акрамя публічных дакументаў мы **шмат працавалі і з унутранымі працэсамі**: абнавілі правілы камунікацыі для каманды, распрацавалі дакументы па працы з валанцёр_камі, абмеркавалі і падрыхтавалі чарнавік фінансавай палітыкі. Усе гэтыя дакументы дапамагаюць не толькі выбудоўваць нашую працу, але і забяспечваць пераемнасць у працэсах і падыходах у арганізацыі.
- Скончылі год **ацэнкай арганізацыйнага патэнцыялу**. Ацэнка дала нам шмат пунктаў для абмеркавання і разважання. І мы адразу запланавалі некаторыя змены для рэалізацыі ў 2025 годзе.

Паводле вынікаў усёй гэтай працы хочацца сказаць каля_жанкам па сектары, што хоць усё гэта і займае шмат часу і патрабуе энергіі і ўключанасці ад каманды, але **вынік таго варты!** Калі ласка, развівайцеся і вы! А мы заўжды радыя падзяліцца сваім досведам і дапамагчы парадай, асабліва ў працы з палітыкамі, працэдурамі і камандай!

# ПЛАНЫ

Улічваючы маштаб і рост дзейнасці ў 2024 годзе гэты раздзел проста не меў шанцаў быць маленькім і сціплым. Сачыце за намі, каб нічога не прапусціць і далучайцеся да нашай дзейнасці ў любых фарматах!

- З 1 па 31 сакавіка правядзем ***«Роўны Сакавік»*** — Месяц за роўнасць, недыскрымінацыю і інклюзію.
- Хочам актывізаваць сваю **працу з валанцёр_камі**, абвесціць новыя наборы ў валанцёрскую каманду, пашырыць працу з тымі, хто ўжо з намі. *Але далучыцца можна ўжо цяпер*, не чакаючы адмысловых абвестак!
- Восенню плануем правесці **Школу роўнасці і інклюзіі** — пілотны фармат, які накіраваны на знаёмства з актывізмам для тых, хто яшчэ нічога пра яго не ведае.
- Восенню мы таксама запланавалі **трэнінг па падрыхтоўцы і правядзенні фармату «Жывая бібліятэка»**, які дапаможа не толькі навучыцца ладзіць сам фармат, але і рыхтаваць і праводзіць мерапрыемствы агулам.
- Зімой задумалі паўтарыць наш улюбёны базавы курс для арганізатар_ак мерапрыемстваў **«Рабі смела!»** у афлайн-фармаце.
- Плануем развіваць і прасоўваць базавы анлайн-курс для самастойнага навучання ***«Курс на каштоўнасці»*** і нашую *адукацыйную платформу*.

- У Вільнюсе штомесяц запланавалі правядзенне **Беларускамоўнага нэтворкінгу**. Але звычайна мы ладзім і што-небудзь яшчэ. Далучайцеся да каналу ў *Тэлеграме «Іншы Вільнюс»*, каб не прапусціць анонсы!
- Марым пра тое, што да канца году ў нас атрымаецца не толькі распрацаваць канцэпт, але і правесці **першую «Інклюзіўную Прэмію»** ад ІншыЯ. Сачыце за навінамі ў снежні, каб ведаць лідар_ак грамадскага сектару!
- Таксама на працягу года ў нас запланаваны **выхад розных матэрыялаў** на тэму скразных каштоўнасцяў як на нашым *сайце*, так і ў *Instagram*, *Telegram* і *TikTok*. Падпісвайцеся на нас, каб не прапусціць карысныя матэрыялы!

# Да сустрэчы на мерапрыемствах і ў анлайн-прасторы!

# ЯК НАС ПАДТРЫМАЦЬ

Калі вам блізкія нашыя каштоўнасці і падабаецца тое, што мы робім, вы можаце падтрымаць нас рознымі спосабамі. **Проста знайдзіце свой!**

## Зрабіце данат!

Выдатны спосаб сказаць нам дзякуй — падтрымаць нас разава або штомесячнай падпіскай на любую суму *на сайце арганізацыі*. А калі вы рэзідэнт_ка Літвы, то штогод вы можаце *пераводзіць нам да 1,2% сваіх падаткаў*.

## Далучайцеся да валанцёрскай каманды!

*Цяпер у нас магчыма валанцёрыць!* Вашыя навыкі могуць дапамагаць прасоўванню правоў чалавека, інклюзіі, гендарнай роўнасці і экапрыязнасці.

## Лайк, каментар, рэпост, падпіска!

Вашыя дзеянні ўплываюць на алгарытмы сацсетак. Праз вашую актыўнасць нашыя публікацыі ўбачыць большая колькасць людзей. Падпісвайцеся на нас у *TikTok*, *Instagram* і *Telegram*. Адзначайце нас праз **@theothersby.**

## Чытайце і дзяліцеся спасылкамі

На сайце *theothersby.org* вы можаце знайсці шмат карыснай інфармацыі на тэму роўнасці і інклюзіі. Не забывайце дзяліцца ёй з іншымі!

## Прыходзьце!

Наведвайце нашыя мерапрыемствы самі і прыводзьце знаёмых. Мы праводзім іх для таго, каб свет рабіўся лепшым. А гэта значыць, што калі вы прыходзіце на нашыя мерапрыемствы, то такім чынам дапамагаеце нам мяняць гэты свет!

## Падпішыцеся на навіны!

Так вы дакладна будзеце ведаць нашыя навіны, а мы будзем разумець, што нашая дзейнасць цікавая для вас. *Лісты* прыходзяць 2-3 разы на месяц.

## Гаварыце!

Раскажыце пра нашую працу сваім знаёмым. У складаныя часы «сарафаннае радыё» з'яўляецца выдатным спосабам распаўсюджвання інфармацыі!

**Дзякуем вам за любую падтрымку і дапамогу!
Мы вельмі шануем вас і дзякуючы вам працягваем сваю працу.**

# КАНТАКТЫ

@othervilnius

@theothersby

info@theothersby.org
theothersby.org

іншыЯ
Дазволь Іншым
быць Іншымі

**VšĮ «The Others BY»**
Код рэгістрацыі 306096505